Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

7 КРАСАВІКА 2022 г. ЧАЦВЕР

№ 67 (29689)

# ЗВЯЗДА

ЯК МІНСК РЫХТУЕЦЦА ДА ВЯСНЫ 3

ТВОРЧЫЯ І АСАБІСТЫЯ САКРЭТЫ ПАДПАЛКОЎНІКА ГАННЫ ЧЫЖ-ЛІТАШ 6

Блізкая ўлада

## ВЫРАШАЮЧЫ ВЫТВОРЧЫЯ ПЫТАННІ, ТРЭБА ВУЧЫЦЦА ПРАЦАВАЦЬ З ЛЮДЗЬМІ

**Пра гэта Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля КАЧАНАВА нагадала падчас наведвання ЗАТ «Агракамбінат «Зара» Магілёўскага раёна.**

Адной з нагод для прыезду ў паспяховую аграгаспадарку стаў зварот некалькіх работнікаў гэтага калектыву. Нядаўна «Звязда» пісала, як падчас адзінага дня прыёму грамадзян, які праводзілі члены Савета Рэспублікі ў Гомельскай вобласці, у Светлагорск да кіраўніка верхняй палаты парламента прыехалі жыхары Магілёўскага раёна, каб звярнуцца са скаргай на непаразуменні, якія ўзнікаюць з новым кіраўніцтвам іх сельгаспрадпрыемства.

Спікер верхняй палаты парламента пачала знаёмства з гаспадаркай з перапрацоўчай галіны, паглядзела, як арганізавана работа ў цэху па вытворчасці птушынага мяса, пагутарыла з калектывам, расказала, якія крокі прымаюцца дзяржавай для захавання стабільнасці і міру. Шмат пытанняў прагучала ад школьнікаў дзвюх вясковых школ, з якімі яна паспела пагутарыць у спартыўнай зале мясцовага Дома культуры перад сустрэчай з працоўным калектывам. У якасці падарунка яна перадала дзецям мячы.

Але самай доўгай па працягласці і вострай па напале эмоцый была гутарка з прадстаўнікамі камбіната. На сустрэчу прыйшло некалькі соцень чалавек з ліку працоўных і пенсіянераў — былых работнікаў аграгаспадаркі.

— Я нават парадавалася, што прыехала сюды, — прызналася пасля размовы з калектывам Наталля Качанава. — З аднаго боку, я сумнявалася, што, сабраўшы столькі работнікаў, ды яшчэ з удзелам кіраўніцтва, пачую адкрытае прызнанне ад людзей. Але, калі пайшла размова аб прадпрыемстве, якое стваралася гадамі, убачыла, наколькі калектыў зацікаўлены ў тым, каб тут быў мір і парадак. Напэўна, людзі нават самі сябе па-іншаму пачулі. Думаю, што для кіраўніцтва гэтага прадпрыемства гэта добры ўрок, таму што задачы, якія сёння стаяць перад кожным кіраўніком, — не толькі вытворчыя паказчыкі і выкананне пастаўленых задач па развіцці твайго прадпрыемства, але і работа з людзьмі. І гэта павінен быць прыярытэт у рабоце кожнага кіраўніка. Таму што ўменне працаваць з людзьмі, адчуваць кожнага чалавека — залог згуртаванасці ў выкананні ўсіх даведзеных паказчыкаў. Разам з тым гэта будзе актыўная, нармальная работа па супрацоўніцтве.

Падобная сітуацыя непаразумення кіраўніцтва з работнікамі можа скласціся на любым іншым прадпрыемстве, заўважыла Наталля Качанава. І паўтарыла: трэба ўмець працаваць з людзьмі. «Для кіраўніка адчуваць калектыў, людзей — гэта асноватворнае. Да таго ж вельмі важна своечасова данесці, якія глабальныя задачы вырашаюцца. Тут, у гаспадарцы, адбываецца шмат чаго: мадэрнізуецца вытворчасць, пашыраюцца экспартныя пастаўкі, усё, што вырошчваецца, перапрацоўваецца, а гэта іншая дабаўленая вартасць, якая ідзе на карысць развіццю гаспадаркі. І людзям трэба пра гэта расказваць. Трэба больш сустракацца, каб яны разумелі, што ёсць пытанні вельмі важныя. Але дробязяў у рабоце кіраўніка быць не павінна. І нават калі здаецца, што пытанне гэта для цябе другараднае, то для чалавека яно мае вялікае значэнне. З людзьмі, калі з імі сустракаешся, трэба размаўляць па-добраму. Нават калі ты не можаш яму чымсьці дапамагчы ў вырашэнні праблемнага пытання, якое сёння, магчыма, заканадаўча і нельга рашыць, трэба так пагутарыць з чалавекам, каб ён цябе пачуў і зразумеў. Гэта вельмі важна», — адзначаліла спікер верхняй палаты парламента.

Падчас сустрэчы з калектывам аграгаспадаркі Наталля Качанава таксама адказала на хвалюючыя пытанні жыхароў, расказала, якая работа праводзіцца ў краіне для недапушчэння пагаршэння ўмоў жыцця, пра манітарынг цэн на тавары і асартымент у крамах. Старшыня Савета Рэспублікі закранула цяперашнія эканамічныя ўмовы, у якіх апынулася наша краіна з-за знешняга ціску. «Мы гэтымі днямі маніторылі цэны ў гандлёвых аб'ектах Мінска. Наша прадукцыя — мяса, птушка і малочныя вырабы — у дастатку. Ёсць, вядома, пытанні наконт асартыменту. У цэлым сітуацыя спакойная, ажыятаж узнялі людзі. Сочым мы і за неабгрунтаваным ростам цэн. Усё гэта на кантролі», — адзначыла яна.

Асобнай тэмай стала абмеркаванне бяспекі нашай краіны і грамадзян. «Я запэўніваю вас: беларускі народ не прымае і не будзе прымаць удзел ні ў якіх ваенных аперацыях. Мы не будзем выбачаць. Нашы продкі ў час Вялікай Айчыннай вайны перажылі жах, холад і голад. Яны заплацілі высокую цану за перамогу, — адзначыла яна. — Беларусь ніколі не будзе нападаць, але калі прыйдуць да нас — мы будзем абараняць сваю краіну, тэрыторыю і незалежнасць. Мы бачым, як змяняецца свет, змяняюцца падыходы, змяняюцца пакаленні. І ў гэтым хаосе нам важна захаваць нашу краіну».

Пасля сустрэчы з працоўным калектывам ЗАТ «Агракамбінат «Зара» Наталля Качанава выслухала ўсіх, у каго былі асабістыя пытанні, і ўзяла на заметку ўсе іх праблемы, якія, як яна паабяцала, будуць разгледжаны дасканала і ўсебакова.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# Красавіцкі ўраджай

Фота Belt.A.

У беларускіх крамах з'явіліся першыя айчынныя памідоры. Адзін з найбуйнейшых пастаўшчыкоў вітамінаў агародніны сталічным пакупнікам — агракамбінат «Ждановічы». Цяпер там поўным ходам ідзе збор ураджаю агуркоў і памідораў. На фота — гароднінавод Марына МАРЗАЛЮК збірае саспелыя таматы.

ЦЫТАТА ДНЯ

**Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:**

*«Без духоўна-маральнага стрыжня выхаваць патрыёта немагчыма. Менавіта таму мы наладжваем вельмі цеснае супрацоўніцтва ў тым ліку і з Беларускай праваслаўнай царквой. У нас ёсць самыя разнастайныя формы ўзаемадзеяння. Мы рэалізуем факультатыў па духоўна-маральным выхаванні навучэнцаў. Пачынаецца гэтая работа ўжо з першых класаў. Мы наладзілі ўзаемадзеянне ўстаноў адукацыі з цэрквамі, якія знаходзяцца побач, каб нашы навучэнцы маглі задаць пытанні, правесці сумесныя мерапрыемствы, семінары, каб моладзь разумела, што такое духоўнасць, якую ролю яна іграе ў нашым жыцці. Мы бачым, што ідзе ціск на нашу краіну з усіх бакоў. У першую чаргу гэты ціск праяўляецца праз спробу разбурыць нашы духоўныя і маральныя асновы, а без іх не будзе нічога».*

Судовыя спрэчкі

## ЧЫЯ НЕРУХОМАСЦЬ?

### Прапіска, высяленне, несапраўдная здзелка, долевая ўласнасць

**Спрэчкі, звязаныя з правам уласнасці людзей на жыллё, складаюць больш як траціну ад усіх жыллёвых праблем, з якімі беларусы звяртаюцца ў суд. Штогод судамі Беларусі разглядаецца больш за тры тысячы такіх спраў, 10 % з якіх завяршаюцца міравым пагадненнем. Суддзі сведчаць, што гэтая катэгорыя спраў лічыцца складанай і сацыяльна значнай. А практыка паказвае, што судовыя памылкі, якія здараюцца пры разглядзе такіх спрэчак, хоць і не носяць сістэмнага характару, але сустракаюцца і абумоўлены адсутнасцю комплекснага падыходу да даследавання і ацэнкі прадстаўленых доказаў. Важнасць закранутай праблемы, а таксама новаўвядзенні ў сферы прымянення судамі заканадаўства пры разглядзе спрэчак, датычных права ўласнасці на жыллё, акрэслілі днямі ў пастанове Вярхоўнага Суда. Пра асобныя новаўвядзенні і існуючыя судовыя памылкі карэспандэнту «Звязды» расказала суддзя Вярхоўнага Суда Інэса ЛАЗАВІКОВА.**

СТАР. 2

Добры прыклад

## АГРАРНЫ ІНТЭНСІЎ АД ГУБЕРНАТАРА

**Пра важнасць даверу ў рабоце, тыл і перадавую ў гарачы сельскагаспадарчы сезон, а таксама пра мары расказалі ўдзельнікі ўнікальнага губернатарскага праекта «З рэзерву — у кіраўнікі», які набірае абароты на Гомельшчыне.**

Намеснік кіраўніка УСП «СлаўМол» Гомельскага раёна Ігар СЦЯПАНАЎ.

СТАР. 3

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Памёр Уладзімір Жырыноўскі

Пасля цяжкай і працяглай хваробы пайшоў з жыцця Уладзімір Жырыноўскі. Пра гэта ў сваім Telegram-канале паведаміў спікер Дзярждумы РФ Вячаслаў Валодзін. «Яркі, таленавіты палітык. Чалавек, які глыбока разумеў, як уладкаваны свет, і шмат што прадбачыў. Лідар фракцыі ЛДПР у Дзяржаўнай думе. Ён заўсёды быў у гушчы падзей. Яго асоба настолькі маштабная, што без яго цяжка ўявіць гісторыю развіцця палітычнай сістэмы сучаснай Расіі», — напісаў Вячаслаў Валодзін. Ён адзначыў, што найлепшая ацэнка дзейнасці Уладзіміра Жырыноўскага — нязменная падтрымка выбаршчыкаў. «Для нас усіх гэта незаменная страта. Някай светлая памяць аб ім заўсёды будзе ў нашых сэрцах», — напісаў Вячаслаў Валодзін. Дэпутаты Дзярждумы Расіі ўшанавалі памяць палітыка хвілінай маўчання і аб'явілі перапынак у пасяджэнні.

### ЗША, Вялікабрытанія і Аўстралія аб'явілі аб супрацоўніцтве ў распрацоўцы гіпергукавых узбраенняў

Члены AUKUS (ЗША, Вялікабрытанія і Аўстралія) аб'явілі аб супрацоўніцтве ў распрацоўцы гіпергукавых узбраенняў і сродкаў абароны ад іх, а таксама ва ўмацаванні ўзаемадзеяння ў кіберсферы. Пра гэта гаворыцца ў распаўсюджанай брытанскім урадам сумеснай заяве трох краін, перадае ТАСС. Як паведаміла раней брытанская газета Financial Times, новая праграма AUKUS можа быць накіравана супраць Кітая, які, паводле ацэнак Пентагона, істотна апярэдзіў Захад у распрацоўцы гіпергукавых сістэм узбраенняў. Пра тое, што Вялікабрытанія пачне распрацоўку гіпергукавой зброі, раней заявіў начальнік штаба абароны краіны Тоні Радакін. Ён звязаў гэты крок з узрослым ваенным патэнцыялам Расіі ў дадзенай сферы. Аб стварэнні партнёрства трох краін у сферы бяспекі было аб'яўлена ў верасні мінулага года. У рамках заключання тады пагаднення Аўстралія плануе з дапамогай амерыканскіх і брытанскіх тэхналогій пабудаваць як мінімум восем атамных падводных лодак, першыя з якіх паступяць на ўзбраенне ў 2036 годзе, а таксама пераасноўцыць свае ўзбройныя сілы амерыканскімі крылатымі ракетамі. У КНР тады папярэдзілі, што стварэнне AUKUS пагоршыць гонку ўзбраенняў, і заклікалі ўдзельнікаў альянсу адмовіцца ад «ментальнасці эпохі халоднай вайны» і «вузкалобых геапалітычных канцэпцый».

### Заражэнне гібрыдам «Амікрона» і «Дэльты» не прыводзіць да ўскладнення захворвання

Заражэнне рэкамбінантам штамаў каранавіруса «Амікрон» і «Дэльта» не прыводзіць да змены эпідэмічнай карціны і цяжару праходжання кавіду. Аб гэтым паведаміла на староннцы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (САЗ) у Twitter кіраўнік тэхнічнай групы САЗ па COVID-19 Марыя Ван Керкховэ. Варта чакаць з'яўлення новых рэкамбінантаў SARS-CoV-2, таму што «вірусы з часам мяняюцца». «Мы трымаем гэта ў поле зроку і вядзём маніторынг», — паведаміла Керкховэ, дадаўшы, што «выключна важна» правядзіць тэсціраванне на кавід і секвеніраванне ўзбуджальнікаў хваробы. Паводле яе слоў, неабходна «ўзмацніць сістэму назірання» за каранавіруснай інфекцыяй.

КОРАТКА

- **Дзярждума Расіі ўчора ў першым чытанні прыняла закон, які дае магчымасць дзяржаўнай карпарацыі «Раскосмас» прыцягваць грамадзян і кампаніі Беларусі да работ і паслуг, звязаных з будаўніцтвам касмадрома.**
- **Еўразійская эканамічная камісія парэкамендавала пры паездках унутры ЕАЭС выкарыстоўваць плацежныя карткі «Мір».**
- **Гомельская абласная арганізацыя Чырвонага Крыжа прызнана найлепшай у краіне.**
- **Мінскія натарыусы 8 красавіка пракансультуюць бясплатна. Кансультацыі правядуць натарыусы сталічных натарыяльных кантор і бюро, размешчаных у Маскоўскім і Партызанскім раёнах сталіцы.**
- **Выстаўку да юбілею мастака-афарміцеля Генадзя Чыстага прадставяць у музеі Багдановіча.**

Даслоўна

**Генадзь КАЗАКЕВІЧ, начальнік крымінальнай міліцыі МУС:**

## «АКТЫ ТЭРАРЫЗМУ НА ЧЫГУНЦЫ БУДУЦЬ ЖОРСТКА СПЫНЯЦЦА ПРАВААХОЎНІКАМІ З ВЫКАРЫСТАННЕМ ЗБРОІ»

**Паводле слоў намесніка міністра ўнутраных спраў Генадзя Казакевіча, экстрэмісцкае фарміраванне Ворпі працягвае адкрыта заклікаць беларусаў да ўчынення тэрактаў на аб'ектах чыгуначнага транспарту і інфраструктуры праз так званы план «Перамога», фактычна фарміруючы на тэрыторыі краіны тэрарыстычныя ячэйкі. «Да гэтай дзейнасці падключыліся іншыя экстрэмісцкія Telegram-каналы. Мы ўжо паведамлялі аб затрыманні асоб, што падазраюцца ў здзяйсненні падобных тэрарыстычных атак. Чарговыя спецаперацыі праведзены ў Бабруйскім і Барысаўскім раёнах», — паведаміў Генадзь Казакевіч.**

Ён паведаміў падрабязнасці затрымання тых, хто мае дачыненне да тэрарызму на чыгуначных пуцях. «У ноч на 30 сакавіка сумесна з Камітэтам дзяржбяспекі пры сілавой падтрымцы САХР затрыманы трое жыхароў Бабруйска — 27 і 28 гадоў, якія маюць дачыненне да знішчэння дзвюх рэлейных шаф сігнальнай установкі пад Асіповічамі. Апаратура, якая забяспечвае рух чыгуначных саставаў, узламаная і спаленая імі. Пры затрыманні тэрарысты аказалі актыўнае супрацьўленне і паспрабавалі ўцячы. Была прыменена зброя на паражэнне. Адзін са злачынцаў паранены і знаходзіцца ў лячэбнай установе. Другому аказана меддапамога на месцы», — сказаў намеснік міністра ўнутраных спраў.

Паводле яго слоў, непасрэдна пасля затрымання ў аўтамабілі падазраваных знойдзены радыёстанцыі і спецыяльна выраблянае прыстасаванне для ажыццяўлення сходу з рэек рухомага саставу, што сведчыць аб іх намеры ўчыніць чарговы тэракт.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

Парламенцкі дзённік

# «ЧАС УСЁ РАССТАВІЦЬ ПА МЕСЦАХ»

## Адносіны паміж Беларуссю і Швейцарыяй незалежна ад палітычнай кан'юнктуры заўсёды развіваліся прагматычна і канструктыўна

**Пра гэта заявіў Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА на сустрэчы з прызначаным Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Швейцарскай Канфедэрацыі ў Беларусі Крысцін ХОНАГЕР-ЗАЛАТУХІН.**

Фота Belta.

«Адносіны паміж краінамі незалежна ад палітычнай кан'юнктуры заўсёды развіваліся прагматычна і канструктыўна. Асабліва заўважна гэта было апошнія гады, калі ў нас станоўча развівалася міжпарламенцкае, гандлёва-эканамічнае, культурнае супрацоўніцтва», — сказаў Уладзімір Андрэйчанка.

Спікер Палаты прадстаўнікоў падзякаваў, што да гэтага часу з цеплынёй успамінае свой першы афіцыйны візіт у Швейцарыю ў 2018 годзе. Падчас яго адбыўся шэраг прадукцыйных сустрэч з кіраўніцтвам краіны і былі дасягнуты важныя дамоўленасці, заўважыў Уладзімір Андрэйчанка.

«Самае галоўнае, што гэтыя дамоўленасці потым паспяхова рэалізоўваліся. Як вы памятаеце, па рашэнні вашага ўрада ў Рэспубліцы Беларусь быў падняты статус дыпламатычнага прадстаўніцтва да ўзроўню пасольства і прызначаны пасол. Актыўна пачало нарошчвацца гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва. Таварааборот быў больш за 300 мільёнаў долараў», — сказаў кіраўнік ніжняй палаты парламента.

Па яго словах, з таго часу ў Беларусі з'явіліся кампаніі са швейцарскім капіталам — «Штадлер», Novartis і іншыя. Уладзімір Андрэйчанка шкадуе, што супрацоўніцтва затармазілася. На яго думку, у гэтым няма віны Беларусі.

«Не хачу сёння абвінавачваць той ці іншы бок. На мой асабісты погляд, гэта вынік палітыкі Злучаных Штатаў Амерыкі, якая актыўна прасоўвае свае інтарэсы ў Еўропе на шкоду інтарэсам іншых дзяржаў, — заявіў спікер Палаты прадстаўнікоў. — Я мяркую, час усё расставіць па месцах».

Ён падкрэсліў, што Беларусь заўсёды была прыхільнікам міру, стабільнасці, бяспекі і хоча хутчэйшага ўрэгулявання расійска-ўкраінскага канфлікту.

«Па ўсіх гэтых кірунках мы гатовыя ў тым ліку да супрацоўніцтва з урадам вашай краіны, — канстатаваў Уладзімір Андрэйчанка. — Я хачу пажадаць вам паспяховай работы ў Рэспубліцы Беларусь, каб мы хутчэй знаходзілі новыя пункты судакранання, выходзілі на прадукцыйныя кантакты, каб пашыраліся беларуска-швейцарскія адносіны і сумесная работа спрыяла ўзмацненню міру і стабільнасці ў Еўропе».

Крысцін Хонагер Залатухін пагадзілася з апошнімі словамі свайго суразмоўніка і выказала задавальненасць, што краіны змаглі адкрыць пасольствы.

«У нас сёлета 30-годдзе дыпламатычных адносін. Калі мы адзначалі гэтую дату 10 лютага, я зразумела, што Швейцарыя раней за многія іншыя краіны прызнала незалежнасць Беларусі. Гэта сведчыць пра тое, што мы ад пачатку былі ўпэўненыя, што ваша краіна важная і нам неабходныя адносіны з вамі», — сказала пасол.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Моцныя рэгіёнамі

# НОВЫЯ ПАЛІКЛІНІКА, ЗАГС, ЖЫЛЫЯ МІКРАРАЁНЫ...

## Пра новыя аб'екты сацыяльнай інфраструктуры ў Маладзечанскім раёне, якія з'явяцца ў гэтай пяцігодцы, расказаў старшыня райвыканкама Юрый ГОРЛАЎ

**— У сакавіку гэтага года ў Маладзечне пасля капітальнага рамонту адкрылася новая бібліятэка. У 2021-м з падтрымкай дзяржавы пабудаваны дзіцячы сад — пачатковая школа. Больш за тры мільёны рублёў было накіравана на добраўпарадкаванне бальніцы № 1. За гэтыя сродкі ўладкавана прылеглая да медыцынскай установы тэрыторыя, адрамантаваны аддзяленні, у тым ліку і радзільнае. Летась завяршылі капітальны рамонт паліклінікі № 1, а сёлета яе адкрылі. Гэта самая буйная паліклініка ў раёне, абслугоўвае больш як 70 тысяч чалавек.**

У развіцці сацыяльнай сферы вялікую падтрымку аказвае дзяржава. Шмат сродкаў укладваецца ў развіццё спорту. У прыватнасці, ідзе капрамонт дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы Маладзечна. Яна спецыялізуецца на такім відзе спорту, як футбол. Летась дзякуючы падтрымцы Мінабліканка і Федэрацыі футбола тут уладкавалі штучныя палі. Адно з іх стандартнае, другое невялікае — для трэніровак. Апошняе лічыцца адным з найлепшых у свеце. З абласной інвестыцыйнай праграмы выдзелены сродкі для заканчэння капітальнага рамонту спартыўнай школы. Тут будуць створаны найлепшыя ўмовы для дзяцей, педагогаў, трэнераў, тэхнічнага персаналу. Прадугледжаны раздзявальні, душавыя, добраўпарадкаванне тэрыторыі. Гэты аб'ект плануецца адкрыць да 3 ліпеня.

Вядома, гораду, дзе шмат моладзі, неабходны новы загс. Яго пачнуць будаваць у найбліжэйшай перспектыве. Праектна-каштарысная дакументацыя падрыхтавана, выдзелены сродкі. Узвядзенне зойме крыху больш за дванаццаць месяцаў. Мяркуецца, што загс адкрыецца налета 9 Мая або 3 Ліпеня — падчас знакавых дат для Беларусі. Гэты аб'ект упрыгожыць горад, размясціўшыся на цэнтральнай плошчы. Сюды пераедзе і служба «Адно акно», якая знаходзіцца пакуль у сціснутых умовах.

З падтрымкай Мінаблвыканкама ў хуткім часе пачнём распрацоўваць праектна-каштарысную дакументацыю для будаўніцтва ў Маладзечне новай паліклінікі, дзе падабрана плошча, якая ўнесена ў генеральны план развіцця горада. У планах — узвядзенне лячэбнага корпуса бальніцы № 1. Да 2025 года гэтыя аб'екты могуць быць уведзены ў дзеянне.

Вядуцца работы і па абнаўленні пуцеправода, які быў пабудаваны ў 1975 годзе. Гэтая артэрыя — адна з самых працяглых у вобласці, цягнецца на 1,3 кіламетра. Абследаванне паказала, што мост не мае вялікіх пашкоджанняў, але капітальны рамонт асобных канструкцый неабходны. Праектная дакументацыя накіравана на карэкціроўку, паколькі распрацоўвалася ў 2017 годзе і патрабуе актуалізацыі.

Што датычыцца дваровых тэрыторый, то гэтае пытанне для Маладзечна больш актуальнае, чым для іншых райцэнтраў Міншчыны. У нас больш за 1200 жылых шматкватэрных дамоў. Сёлета з раённага бюджэту выдзелілі сродкі на іх добраўпарадкаванне. Мы робім гэта не толькі ў райцэнтры, але і такіх буйных населеных пунктах, як Радашковічы, Чысць, Беразінскае. Усе дваровыя тэрыторыі ўладкавалі ў Баярах і Турцы, дзе пражывае больш за тысячу чалавек. На гэта было выдаткавана 250 тысяч рублёў.

Шмат увагі ўдзяляецца будаўніцтву жылля. У гэтым годзе пачнецца ўзвядзенне 11 шматпавярховікаў з дзяржаўнай падтрымкай, у першую чаргу

для шматдзетных сем'яў. Летась заблеслі жыллём 134 такіх сям'і, сёлета абзавядуцца дахам над галавой 590 сем'яў. Вырашаюцца і жыллёвыя праблемы ваеннаслужачых, работнікаў сацыяльнай сферы — адукацыі, аховы здароўя, культуры.

Многія, хто стаіць на чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў, магчыма, будуць жыць у новых мікраранёах. У прыватнасці, узводзіцца з нуля мікрараён імя Янкі Купалы. Тут плануецца восем дамоў, чатыры з іх з'явіліся ў гэтым годзе, чатыры плануецца здаць у наступным. Ушчыльняецца і мікрараён № 4, дзе дабудоўваюцца тры дамы. Распрацавана канцэпцыя плана дэтальнай планіроўкі новага мікрараёна № 8. Ёсць шэраг пляцовак, над якімі працуем адпаведна з генеральным планам. Тамы гэтых пляцовак дастаткова, каб у найбліжэйшую пяцігодку забяспечыць жыхароў горада жыллём.

Штогод у Маладзечне адкрываецца каля 20 невялікіх прамысловых прадпрыемстваў, дзе працуе да 100 чалавек. Два гады таму Маладзечанскі раён уваходзіў у пералік рэгіёнаў з напружанай сітуацыяй на рынку працы. Цяпер ён выключаны з гэтага спісу, сітуацыя стабілізавалася. Каля 100 чалавек стаіць на чарзе ў цэнтры занятасці насельніцтва. Прычым у гораде прапаноўваецца 1000 вакансій.

Маладзечна стаў адным з 11 гарадоў з колькасцю жыхароў больш за 80 тысяч, дзе рэалізуецца канцэпцыя паскоранага сацыяльна-эканамічнага развіцця. У межах дадзенага дакумента распрацаваны адпаведны план, які дасць штуршок для інтэнсіўнага развіцця ўсіх сфер раёна.

**Запісала Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# «АКТЫ ТЭРАРЫЗМУ НА ЧЫГУНЦЫ БУДУЦЬ ЖОРСТКА СПЫНЯЦЦА...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Затрыманыя ўжо даюць прызнальныя паказанні, у тым ліку аб сваіх куратарах з Вурокі. Што важна, матыў учынення злачынстваў — карыслівы. За акцыю яны атрымалі ў эквіваленце $1 тысячу.

Акрамя таго, 1 красавіка пры сілавой падтрымцы спецпадраздзялення «Алмаз» быў затрыманы падазраваны ў аналагічным злачынстве, учыненым у ноч з 24 на 25 сакавіка ў Барысаўскім раёне. «Яго затрыманне стала магчымым у многім дзякуючы неабыякавым грамадзянам, якія паведамілі ў міліцыю аб аўтамабілі, што стаяў на працягу некалькіх гадзін непадалёку ад месца ўчынення злачынства. Тэрарыстам аказаўся 40-гадовы жыхар Мінскага раёна, раней судзімы за забойства з асаблівай жорсткасцю. Пры затрыманні ён таксама аказаў актыўнае супраціўленне, міліцыяй была прымененa зброя на паражэнне. Злачынца паранены і знаходзіцца ў лячэбнай установе. Падчас вобыску ў доме і аўтамабілі зламысніка знойдзены і канфіскаваны некалькі адзінак зброі, радыёстанцыі, бінокль, ноўтбук, мабільныя тэлефоны, што сведчыць аб старанным падрыхтоўцы да ўчынення злачынства. Як і ў папярэднім выпадку, рухаючым матывам стала карысць», — паведаміў Генадзь Казакевіч.

Ён дадаў, што супрацоўнікі МУС маюць дакладную аператыўную інфармацыю аб тых, хто мае намер учыніць тэракты на аб'ектах чыгуначнага транспарту. У найбліжэйшы час яны будуць затрыманы.

Паводле яго слоў, у перыяжнай большасці відовых Міністэрству ўнутраных спраў выпадкаў арганізатарамі з'яўляюцца замежныя экстрэмісцкія цэнтры і фарміраванні. «Што асабліва хочацца падкрэсліць: матыў выканаўцаў выключна карыслівы. Два апошнія факты сведчаць аб тым, што яны атрымліваюць за гэтыя дзеянні грошы», — сказаў Генадзь Казакевіч.

Ён расказаў, з чым звязаная актыўнасць злачынцаў, якія спрабуюць здзяйсняць падобныя супрацьпраўныя дзеянні. «На наш погляд, такая актыўнасць звязана з жаданнем разварушыць сітуацыю ўнутры краіны. Пры гэтым як інфармацыйная нагода выкарыстоўваецца спецыяльная аперацыя расійскіх войскаў на Украіне. Адзначу, што беларускія грамадзяне не падтрымліваюць такія дзеянні. Наша грамадства разумее, што любая тэрарыстычная атака з'яўляецца пагрозай для простых людзей. І толькі потым — для дзяржавы. І грамадзяне аказваюць нам дапамогу ў раскрыцці гэтых злачынстваў», — расказаў Генадзь Казакевіч.

«МУС папярэджвае, што дзеянні асоб, якія маюць намер учыняць такія дывэрсіі на Беларускай чыгунцы, будуць жорстка спыняцца з выкарыстаннем зброі. Ад адказнасці не ўцячэ ніхто», — сказаў на заканчэнне Генадзь Казакевіч.

Эканоміка

# БЕЛАРУСКАЯ ЭКСПАЗІЦЫЯ БУДЗЕ ПРАДСТАЎЛЕНА НА ГАЛОЎНАЙ ВЫСТАВЕ КЕНІІ

**Сёлета з 9 да 11 чэрвеня ў Найробі пройдзе галоўнае выставачнае мерапрыемства Усходняй Афрыкі — XXIII Міжнародная выстава Kenya International Trade Exhibition (KITE). У гэтай падзеі другі раз возьмуць удзел беларускія кампаніі — у фармаце маштабнай нацыянальнай экспазіцыі. Экспаненты прадставяць тавары і паслугі, запатрабаваныя ў Кеніі: тэхніку, харчаванне, сельскагаспадарчыя тэхналогіі і іншае.**

У чым прывабнасць афрыканскага рэгіёна для прадпрыемстваў з Беларусі?

А адказы ляжаць на паверхні. Як аказалася, шэсць з дзесяці самых хуткарослых эканомік свету — афрыканскія. На кантыненце актыўна ідзе ўрбанізацыя, стварэцца неабходная для жыцця і вытворчасці інфраструктура, імкліва развіваецца сельская гаспадарка. Эксперты прадказваюць, што праз 15—20 гадоў Афрыка стане «новым Кітаем» па эканамічнай моцы.

Нагадаем, што Беларусь у 2019 годзе ўпершыню прадставіла нацыянальную экспазіцыю на Міжнароднай выставе прадуктаў харчавання, гасцінічнага бізнесу і сельскай гаспадаркі FoodAgro, якая з'яўляецца складнікам выставы Kenya International Trade Exhibition.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю САКАЛОВА Яфрэма Яўсеевіча, былога першага сакратара Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі, і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю былога першага сакратара Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі, вядомага дзяржаўнага і палітычнага дзеяча САКАЛОВА Яфрэма Яўсеевіча, і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага скліканння ПАЛЕЙЧУКА Аляксандра Іванавіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**Калектыў Рэспубліканскага цэнтра дзяржаўнай акадэмічнай эксперты і павышэння кваліфікацыі Мінпрыроды з жалем паведамляе аб смерці заслужанага чалавека ў сістэме Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь.**

**4 красавіка 2022 года пайшоў з жыцця Аляксандр Мікалаевіч Рачэўскі — адзін з сааўтараў Закона «Аб ахове навакольнага асяроддзя», уладальнік звання «Ганаровы эколаг», ордэна Пашаны, медаля «За працоўныя заслугі» і медаля Саюзнай дзяржавы «За супрацоўніцтва».**

**Аляксандр Мікалаевіч нарадзіўся 14 студзеня 1947 года ў г. п. Брагін, з дзяцінства спалучаў шчырую цікавасць да прыроды і навуковы падыход да яе пазнання.**

**За сваю працяглую працоўную дзейнасць прайшоў шлях ад радавога супрацоўніка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта да начальніка ўпраўлення міжнародна супрацоўніцтва і навукі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь.**

**Аляксандр Мікалаевіч актыўна ўдзельнічаў у распрацоўцы ключавых нарматыўных прававых актаў, якія вызначылі парадак прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя ў Рэспубліцы Беларусь. Знаходзячыся на пенсіі, працягнуў прыродаахоўную дзейнасць у міжнародным падраздзяленні ў Белгідрамедзе, а таксама ў Рэспубліканскім цэнтры дзяржаўнай экалагічнай экспертызы і павышэння кваліфікацыі Мінпрыроды.**

**Аляксандр Мікалаевіч Рачэўскі назаўсёды застанецца ў нашай памяці як прыстойны, чулы і спагадлівы чалавек з цудоўным пачуццём гумару, прафесіянал найвышэйшага класа.**

**Выказваем глыбокія спачуванні родным і блізкім. Мы смуткуем разам з вамі.**

# ЧЫЯ НЕРУХОМАСЦЬ?

### ПРАВА НА ЖЫЛЛЁ І АБАРОНУ «МЕТРАЎ»

Жыллёва-прававыя адносіны ў Беларусі рэгулююцца найперш Жыллёвым кодэксам, новая рэдакцыя якога ўступіла ў сілу ў 2020-м, а тая частка пытанняў, якія гэтым дакументам не закранутыя, — Грамадзянскім кодэксам, заўважыла суддзя:

— Судовыя памылкі па спрэчках, звязаных з правам уласнасці на жыллё, абумоўлены тым, што такія праблемы не ўрэгуляваны нейкім адным кодэксам ці нарматыўным актам, а абапіраюцца на палажэнні грамадзянскага і жыллёвага заканадаўства, а таксама Шлюбна-сямейнага кодэкса і іншыя нарматыўна-прававыя акты. Законы не супярэчаць адзін аднаму, у некаторых момантах дапаўняюць, у некаторых — даспасоўваюцца, у некаторых узнікаюць пытанні, якія патрабуюць у будучыні нейкай заканадаўчай карэкціроўкі.

Рэалізаваць сваё канстытуцыйнае права на жыллё ў Беларусі грамадзяне могуць шляхам яго будаўніцтва або набыцця ва ўласнасць. Меры, якія прымаліся для сцяжэння ў краіне, і разыццё камерцыйнага жыллёвага будаўніцтва прывялі да значнага росту прыватнага жылля. У 2021-м ва ўласнасці жыхароў знаходзілася ўжо 94 % ад усяго жылфонду краіны, абазначыла Інэса Лазавікова:

— Павелічэнне долі ўласнага жыцця грамадзян суправаджаецца ўкараненнем у жыллёвую сферу рыначных адносін. Прыватнае жыллё ўсё часцей становіцца аб'ектам эканамічнага абароту, выступае прадметам розных грамадзянска-прававых дзэлак. Згодна з інфармацыяй Нацыянальнага кадастравага рэгістра нерухомасці, летась зарэгістравана каля 25 тысяч дзэлак па жылых памяшканнях, якія належаць грамадзянам на правах уласнасці. У сувязі з гэтым усё большае значэнне набывае гарантаваная дзяржавай прававая абарона права ўласнасці грамадзян на жыллё. А найважнейшую ролю ў забеспячэнні юрыдычных гарантый іграе судовая абарона жыллёвых правоў людзей.

### КАБ ВЫКЛЮЧЫЦЬ СУДОВЫЯ ПАМЫЛКІ

Дзеля правільнага і аднастайнага прымянення судамі прававых норм аб праве ўласнасці на жылыя памяшканні Пленумам Вярхоўнага Суда (ВС) 26 сакавіка 2003 года была прынята пастанова № 2 аб прымяненні судамі заканадаўства пры вырашэнні такога роду спрэчак. Значная частка прынятых тады тлумачэнняў, датычных прававога рэгулявання жыллёвых адносін, якое закранула ў тым ліку і права ўласнасці на жылыя памяшканні, захоўвае актуальнасць і выкарыстоўваецца цяпер. Аднак шмат што змянілася.

— Напрыклад, страціў сваё першаснае значэнне інструктыў прыватызацыі дзяржаўнага жылфонду — ільготную прыватызацыю дзяржжылля ў Беларусі адмянілі 1 ліпеня 2016-га. Са сферы нарматыўнага рэгулявання прававых адносін аб сумесным домаўладанні выключаны нормы, якія датычацца сумеснай уласнасці ў жылфондзе. Яны рэгулююць цяпер толькі фонд нежылых памяшканняў, — расказала эксперт. — Змяніліся і нормы Грамадзянскага кодэкса, якія рэгулююць адносіны, звязаныя з правам уласнасці на жыллё. Неаднаразова змяняўся таксама закон аб дзяржрэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй. Усё гэта аб'ектыўна патрабуе змен у шэрагу прававых пазіцый, замацаваных у пастанове Пленума ВС 2003 года.

Вярхоўны Суд вывучыў 263 справы, якія былі разгледжаны ў першай палове 2021-га з розных рэгіёнаў краіны. Вынікі паказалі, што суды ў асноўным правільна прымяняюць заканадаўства аб асабістых правах на нерухомую маёмасць. Разам з тым устаноўлена, што на некаторых пытаннях суды не заўжды дакладна арыентуюцца ў нормах матэрыяльнага права, якія прымяняюцца. Адчуваюць цяжкасці ў вызначэнні магчымых сродкаў доказавання і працэсуальных спосабах абароны правоў па спрэчках, звязаных з узнікненнем і рэалізацыяй права ўласнасці на жыллё, падзялілася суддзя:

— Прынамсі, адзначаны памылкі ў прымяненні норм, датычных права ўласніка на выселенне з памяшкання, што яму належыць, паўнаletніх і былых членаў яго сям'і, якія не маюць долі ў праве ўласнасці на жыллё. Цяжкасці выклікаюць і справы, звязаныя з правам уласнасці на жылыя памяшканні, якія ўзведзены ці набыты сужэнцамі ў шлюбе. Акрамя таго, суды не заўжды правільна прымяняюць дзеючыя нарматыўныя палажэнні аб несапраўднасці здзелак з аб'ектамі нерухомасці, дапускаюць памылкі пры разглядзе вендыкацыйных патрабаванняў, якія прад'яўляюцца ўласнікамі жылля да добрасумленных набытчыкаў памяшканяў, іншымі словамі, аб выпатрабаванні маёмасці з чужога незаконнага ўладання.

Усе гэтыя пытанні, на думку эксперташ, патрабуюць сістэмнай прапрацоўкі і ўніфікавання падыходу да іх вырашэння, выключаюць неабходнасць адпаведных нарматыўных тлумачэнняў. Абазначаныя праблемы якраз і ляглі ў аснову змен, прынятых у новай пастанове Пленума ВС.

Прынамсі, у ёй абазначаны парадак абароны правоў ўласніка маёмасці. У дакумент таксама ўключаны палажэнні, якія датычацца спрэчак, звязаных з жылымі памяшканнямі, дзе маюцца самавольныя надбудовы, прыбудовы ці перабудовы (іх нельга падзяліць да завяршэння будаўніцтва і рэгістрацыі, можна падзяліць толькі будаўнічыя матэрыялы, з якіх ствараюцца такія надбудовы). Пры вывучэнні спраў аб прызнанні права ўласнасці на самавольную надбудову высветлілася, што ў шэрагу выпадкаў пасля афармлення чалавекам права ўласнасці на самавольна ўзведзеную прыбудову за ім прызнавалася і права на зямельны ўчастак, які быў створаны ў выніку крымінальных дзеянняў. Каб пазбегнуць такіх фактаў, у абноўленай пастанове прапісана, што суд можа прызнаць права ўласнасці на самавольную прыбудову, калі набыццё права на зямельны ўчастак з гэтай прыбудовай не звязана са здзяйсненнем злачынства.

### АДМАЎЛЕННЕ АД ІСКУ ЦІ МІРАВОЕ ПАГАДНЕННЕ

Статыстыка сведчыць, што на працягу апошніх пяці гадоў назіраецца тэндэнцыя па нявыплаце змяншэнні спраў, што датычацца жыллёвых спрэчак. Між тым яны займаюць каля 7 % ад разгледжаных спраў іскавай вытворчасці.

Праблемы, звязаныя з правам уласнасці на жыллё, найчасцей узнікаюць паміж сваякамі ці былымі сужэнцамі і іх паўналетнімі ці непаўналетнімі дзецьмі. Удзельнікамі падобных спрэчак могуць быць таксама асобы, паміж якімі няма сваяцтва, але яны маюць у долевай уласнасці жылыя памяшканні.

— Да катэгорыі спраў, звязаных з правам уласнасці на жыллё, адносіцца, у прыватнасці, выселенне з жылля з вылучэннем ці без вылучэння іншага памяшкання. Справы аб прызнанні права ўласнасці на жылыя памяшканні, аб іх раздзеле, аб прызнанні здзелак з жылымі памяшканнямі несапраўднымі, — прывяла прыклады Інэса Лазавікова. — Штогод па 75 % такіх спраў прымаюцца рашэнні, і ў 81 % выпадкаў заяўленыя патрабаванні задавальняюцца. У 23 % вытворчасць па справах гэтай катэгорыі спыняецца з-за адмаўлення ад іску або ў сувязі з заключэннем міравога пагаднення.

Прычыны спынення справы маюць розныя юрыдычныя наступствы. Калі справа скончана ў сувязі з адмаўленнем ад іску, паўторна з такім патрабаванням звярнуцца ў суд ужо будзе немагчыма, нават калі адкрыюцца новыя абставіны. У выпадку міравога пагаднення абгаворваюцца ўмовы, згодна з якімі бакі могуць, напрыклад, добраахвотна падзяліць жыллё. Пагадненне мае юрыдычную сілу рашэння, і патрабаваць выканання яго ўмоў можна прымусова, калі хтосьці з бакоў адмовіцца ад папярэдніх дамоўленасцяў. Ёсць прыклады і дамаўлення спрачальнікаў праз медыяцыю, аднак пакуль іх няшмат, патлумачыла суддзя:

— Уласнікам жылля той, хто здубавў яго, можа афіцыйна лічыцца толькі з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі ўзнікнення права ўласнасці. Прыналежнасць жылля неабходна зафіксаваць у адпаведнай тэрытарыяльнай ці рэспубліканскай арганізацыі па дзяржрэгістрацыі. Необходна дзяржрэгістрацыя таксама і пераходу права ўласнасці набытчыку жылля па дагаворы: дарэння, мены, куплі-продажу, наследавання, рэнты, а таксама самога дагавора.

### ПРАВІЛА «КАМУНАЛКІ»

Нормы жыллёвага заканадаўства рэгулююць таксама правілы пражывання ў жыллі, дзе ўласнікамі на правах долевай уласнасці з'яўляецца некалькі асоб. У краіне дагэтуль існуе жыллё, якое смела можна назваць «камунальнай кватэрай», бо валодаюць памяшканнямі ў ім часта асобы, якія нават не прыходзяцца адно аднаму сваякамі.

— Калі адзін з такіх уласнікаў хоча даць сваю долю памяшкання для пражывання іншым грамадзянам (напрыклад, па дагаворы найму або ў бязвыплатнае выкарыстанне), ён павінен атрымаць пісьмовую згоду ад усіх астатніх уласнікаў — удзельнікаў гэтай долевай уласнасці, — расказала Інэса Лазавікова. — Калі такая згода не атрымана, то астатнія ўласнікі могуць па судзе патрабаваць устарання перашкод у ажыццяўленні сваіх правоў на жылое памяшканне, у прыватнасці, шляхам выселення, зняцця з рэгістрацыйнага ўліку асобы, якая арандуе памяшканне, бо такім чынам парушаны іх правы на жылое памяшканне.

Усяліць на сваю долевую ўласнасць і зарэгістраваць на гэтай плошчы без згоды іншых уласнікаў маёмасці можна толькі членаў сваёй сям'і: сужэнца, бацькоў ці дзяцей. Удзельнік долевай уласнасці не можа ўзяць да сябе жыць ні другую палову, калі яны афіцыйна не пабраліся шлюбам, ні іншага сваяка, ні сябра.

**Ірына СІДАРОК.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# АГРАРНЫ ІНТЭНСІЎ АД ГУБЕРНАТАРА

Іван КРУПКО на сустрэчы з рэзідэнтамі ў Гомельскім аблвыканкаме.

## НОВЫ ЖЫЦЦЁВЫ РЫТМ

Для Ігара Сцяпанава як для сапраўднага аграрыя час і прастора — катэгорыі не фізічныя, але жыццёвыя. Цяпер — асабліва. Бо новы статус давялося прымяраць у самы напружаны час — пасяўную. Былы галоўны аграном, а цяпер намеснік кіраўніка УСП «Слаўмол» Гомельскага раёна — адзін з удзельнікаў праекта «З рэзерву — у кіраўнікі». Ён з ліку тых дзеячаў, якія атрымалі новыя пасады ў сваіх гаспадарках.

— У рабоце нічога не змянялася, але вырасла адказнасць за людзей, за выкананне работы. Цяпер унікаю адразу ва ўсе галіны — жывёлагадоўля, раслінаводства і механізацыя, — расказвае рэзервіст па тэлефоне.

Звязацца з ім было складана. У кабінеце не застаець. На рабоце з сямі гадзін і, як кажа, да ўпору. Мабільны тэлефон ужо з раніцы грачы ад званкоў. Але галава халодная, і кружыць ёй няма калі, запэўнівае 28-гадовы суразмоўнік.

— Адказваю цяпер за ўсіх у гаспадарцы, а гэта 380 чалавек. Паралельна асвойваю праграму падрыхтоўкі. Адначасова буду праходзіць завочнае навучанне на птушкафабрыцы «Світанак», — тлумачыць Ігар Сцяпанаў.

У роднай гаспадарцы ён вырас з брыгадзіра паляводчай брыгады да галоўнага агранома. Кажа, што заўсёды адчуваў: дыплом сельскагаспадарчага ўніверсітэта — добра, але веды лішнімі не бываюць. Таму актыўна цікавіўся сумежнымі напрамкамі сельскай гаспадаркі. Работа на зямлі для яго — цалкам асэнсаваная жыццёвая пазіцыя. Скандэнтравацца на ёй дапамагае і надзейны тыл. Гатовыя маральна падтрымаць у новым жыццёвым рытме жонка з сынам і бацькі, якія, дарэчы, усё жыццё прапрацавалі ў той жа арганізацыі, што і сын.

Праект «З рэзерву — у кіраўнікі» — шанц, упэўнены Ігар Сцяпанаў, для такіх жа, як ён, маладых аграрыяў, якія мараць вывесці айчынную сельскую гаспадарку на новы ўзровень. Праект — перафарматаваная «Школа маладога кіраўніка», якая з 2018 года працавала ў рэгіёне. Старшыня аблвыканкама Іван Крупко выступіў з ініцыятывай перагледзець падыходы ў рабоце з рэзервістамі і скандэнтравацца на падрыхтоўцы кіраўнікоў-аграрыяў.

Губернатар акрэсліў задачу для ўсіх кадравых службаў раёнаў: вырашэнне праблемы дэфіцыту кіруючых кадраў у АПК патрабуе нетрывіяльных падыходаў. На Гомельшчыне ёсць прыклады моцных сельгаспрадпрыемстваў, у кіраўнікоў такіх гаспадарак перспектыўныя маладыя спецыялісты могуць прайсці школу менеджменту і праявіць сябе.

Нагадаем, што ў лютым жаданне ўдзельнічаць у праекце «З рэзерву — у кіраўнікі» выказала каля 300 аграрыяў. У фінал выйшлі 24 — тыя, хто вытрымаў экзамены асабіста ў старшыні аблвыканкама Івана Крупко. Шэсць чалавек выказалі жаданне адразу заступіць на пасады дырэктараў сельгаспрадпрыемстваў. Астатнія былі размеркаваныя ў паспяховыя базавыя сельгасарганізацыі наменскімі кіраўнікоў. Так унікальны кадравы праект ахапіў 25 гаспадарак 15 раёнаў Гомельшчыны.

## БАЗА ДЛЯ ПОСПЕХУ

На Мазыршчыне ў праекце ўдзельнічаюць чатыры базавыя сельгасарганізацыі. У «Козенках-Агра» прынялі Уладзіміра Грыба. Аграном з Калінкавіцкага раёна лічыць, што яму вельмі пашанцавала. Яго настаўнік Сяргей Сінькевіч — у прафесіі амаль 40 гадоў, пры гэтым не стамляецца вучыцца і развівацца, гатовы дзяліцца сакрэтамі паспяховай работы і ўзаемадзеяння з калектывам. Удзельнік праекта «З рэзерву — у кіраўнікі» Андрэй Чарнякоў прызначаны ў гаспадарку «Хутар-Агра» Светлагорскага раёна. Новага работніка забяспечылі жыллём. Рэзервіст прызнаўся, што даўно задумваўся пра кар'еру, але толькі падчас асабістай сустрэчы з губернатарам канчаткова зразумеў для сябе: гатовы, хоча і можа.

Згодна з праграмай праекта рэзервісты будуць стажыравацца на пасадзе намесніка кіраўніка на працягу шасці месяцаў. Акрэслены і канкрэтныя задачы для іх: пашырыць веды па асноўнай прафесіі і напрацаўваць вопыт па іншых, у тым ліку па эканоміцы і жывёлагадоўлі, адпрацаваць усе працэсы паслясяўной і ўборачнай кампаній. Таксама ў праекце прадугледжаны тэарэтычная частка і экзамены.

Паводле ацэнкі кіраўніка рэгіёна, 70—80 % удзельнікаў да канца года змогуць упэўнена ўзначаліць любую мясцовую сельскагаспадарчую арганізацыю.

## ДАВЕР І ПАВАГА — СПАГНАННЕ ПАСЛЯ

Сярод тых удзельнікаў, што былі адразу прызначаны на пасады кіраўнікоў гаспадарак, — новы дырэктар ААТ «Вялікастралкоўскі» Рагачоўскага раёна Андрэй Трафімаў. 26-гадовы аграрый у свае гаспадарцы «Мормаль» Жлобінскага раёна з пасады галоўнага інжынера быў прызначаны начальнікам сельгасучастка, цяпер ён запрошаны Рагачоўскім райвыканкамам на пасаду кіраўніка гаспадаркі.

Максім Чыкуноў спачатку разлічваў пайсці наменскам дырэктара на найлепшае ў сваім раёне прадпрыемства «Беларуснафта-Асобіна», а пасля экзамену ад губернатара пагадзіўся працэхаць на Веткаўшчыну, каб узначаліць ААТ «Нямкі».

Як адзначылі новыя кіраўнікі, на даручаных прадпрыемствах яны наўпрасткі на стварэнне моцнай каманды, выкананне тэхналагічнай дысцыпліны, беражлівае стаўленне да тэхнікі і рэсурсаў. У рабоце мараць дастойна вытрымаць поўны цыкл усіх сельскагаспадарчых работ. Пасля — зрабіць дэталёвую работу над памылкамі, а ў наступны сезон увайсці са сваім калектывам як з моцнай камандай. Між тым, вядома, што кожны прызначаны цяпер малады кіраўнік гаспадаркі будзе забяспечаны ўсебаковай падтрымкай аблвыканкама, можа разлічваць на матэрыяльную, тэхнічную і любую кансультацыйную дапамогу.

Па выніках работы будуць заахвочаны і кіраўнікі гаспадарак, якія ўзялі да сябе на работу новых рэзервістаў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

У аблвыканкаме «экзамену» ад губернатара чакалі ўдзельнікі праекта.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# «У вясновы перыяд мы зробім акцэнт на МКАД»

## Як у 2022 годзе будуць весціся работы па добраўпарадкаванні і азеляненні Мінска?

Фота БелТА

**З адыходам халоднага надвор'я і з'яўленнем вясновага настрою сталічныя жыхары пачынаюць праводзіць усё больш часу ў мясцовых дварах. Цяжкі зімовы клімат пакідае негатыўныя наступствы як на асфальце, так і на праезнай частцы.**

Як жа сталічныя ўлады мяркуюць сёлета вырашаць праблему добраўпарадкавання дваровых тэрыторый? Пра гэта расказвае **Анастасія ВАРАБ'ЁВА, намеснік генеральнага дырэктара па добраўпарадкаванні, санітарным утрыманні жыллёвага фонду Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі.**

*— Ужо чатыры гады выконваюцца работы па капітальным рамонце дваровых тэрыторый у Мінску. За гэты перыяд адрамантавана 137 двароў — работа будзе працягнута і далей. На гэты год запланаваны капітальны рамонт 14 такіх тэрыторый. Капрамонт прадугледжвае работы па аднаўленні парушаных аб'ектаў добраўпарадкавання. Гэта замена пешаходных пераходаў, дваровых праяздаў, дзіцячага і спартыўнага абсталявання і г. д.*

Анастасія Вараб'ёва таксама адзначыла, што па рамонце дваровых тэрыторый запланавана работа з 743 аб'ектамі. Нагадаем, што з 14 сакавіка да 23 красавіка праводзіцца традыцыйны вясновы месячнік па прыборцы, азеляненні і добраўпарадкаванні Мінска. А на 16 красавіка запланаваны рэспубліканскі суботнік. Удзел у гэтых мерапрыемствах возьмуць і жыхары сталіцы.

Не засталіся незаўважанымі пытанні, адказы на якія важныя для ўсіх уладальнікаў аўтамабіляў. Ямы і «дарожныя дзіркі» — галаўны боль шматлікіх мінскіх дарог. З імі ўжо разбіраюцца, прыводзяць у парадак дарожнае пакрыццё.

—Вельмі добра спалучаецца. Калі б не было свабоды, чалавек не мог бы практыкавацца ў добрым. Уявіце, што вы едзеце па горнай дарозе: з аднаго боку — высокая скала, з другога — абрыў. Вы бачыце знак «Небяспечная абочына» і свабодныя гэты знак ігнаруюць. Гэтак жа і рэлігійныя запаведзі: яны не абмяжоўваюць чалавечую свабоду, але паказваюць прастору, дзе чалавек можа існаваць не толькі бяспечна, але і шчасліва. Мы вольныя выбіраць. Інакш былі б паслухмянымі біяробатамі, якія ўсё робяць правільна. Але мы тады былі б не здольныя на шчасце і любоў.

Маленькіх дзяцей бацькі не пускаюць да адкрытага акна, яны іх абмяжоўваюць, і гэта на карысць. Потым дзеці вырастаюць, могуць свабодна падыходзіць да акна, самі адкрываць яго. Яны гэтак жа могуць выпасці, але ўжо ведаюць пра небяспеку.

***— Неяк пачула думку пра тое, што калі б можна было даказаць існаванне Бога, то чалавек быў бы пазбаўлены свабоды.***

— Свабоды верыць ён быў бы пазбаўлены, але не свабоды ўвогуле. Адам — першы чалавек, які сагрышыў, — бачыў Бога, дакладна ведаў, што Бог ёсць, тым не менш быў свабодны і свабодна абраў непаслушэнства.

Парадокс у тым, што сапраўдная свабода набываецца тады, калі чалавек паступае ў адпаведнасці з запаведзямі Божымі, выбірае дабро, ідзе гэтым шляхам, і ў пэўным сэнсе ён становіцца несвабодным, бо маральна ўжо не можа рабіць інакш.

***— Што азначае выказванне: «Дух дыхае, дзе хоча»?***

— Гэта пра тое, што чалавек не можа падпарадкаваць сабе Бога. У тым сэнсе, што ніякімі рэлігійнымі абрадамі, практыкамі мы не можам гарантаваць станоўчы адказ Госпада. Бог заўсёды свабодны ў сваіх зносінах з чалавекам, і нам часам вельмі складана разумець, чаму Ён паступае так або інакш.

***— Інакш кажучы, святым можа стаць любы чалавек?***

— Першым увайшоў у рай разбойнік, які быў распяты не проста так, яго пакаранне не было судовай памылкай. Тым не менш у апошні момант свайго жыцця ён звярнуўся да Бога і гэтага было дастаткова.

***— Вы сказалі, што чалавек, які аднойчы выбраў дабро, схіляецца ў бок дабра. Але ў малітве пра спачылага ёсць словы: «Няма чалавека, які жыў і не саграшыў». Атрымліваецца, што не грашыць немагчыма.***

— Чалавеку самому не грашыць немагчыма. Тут неабходна супрацоўніцтва з Богам. Мы можам імкнуцца да святасці, але калі б гэта было магчыма толькі нашымі сіламі, то не трэба было б нараджацца, памірацца і ўваскрасцаць Хрыстоў. Менавіта таму, што чалавек, калі дорасліваў дабро ад зла, не мог сваімі сіламі зло перамагчы, спатрэбілася звышнатуральная дапамога Бога — Яго прыход у гэты свет, бо чалавечая прырода пашкоджаная. Ёсць такое паняцце — прыроднасць грэх. Гэта не той грэх, які здзейсніў некалі Адам (то быў яго асабісты грэх). Але ён перадаў усім сваім патомкам тое, што на царкоўнаславянскай мове называецца «удобопреклонностью» да граху — схільнасць лёгка грашыць.

Самім нам нераадолець пашкоджанасць уласнай прыроды не пад сілу. Але яна была пераадолена ў асобе Ісуса Хрыста. У Ім чалавек зноў цалкам падпарадкаваўся Богу. Хрыстос быў адначасова і чалавекам, і Богам. І як чалавек Ён настолькі палюбіў Бога, што аказаўся гатовы прайсці праз усе пакуты. Ён па-чалавечы пакутаваў, па-чалавечы памёр і потым уваскрэс.

Грэх у абсалютным сэнсе ёсць адзяленне чалавека ад Бога. Хрыстос гэтую сцяну разбурыў. У Евангеллі вельмі выразна бачныя праявы Яго чалавечай прыроды. Згадайце малітву пра чашу: «Ойча Мой! Калі магчыма, хай абміне Мяне чаша гэтая; але не як Я хачу, а як Ты». Па-чалавечы Яму было вельмі страшна, цяжка, але Ён сказаў: «Не як Я хачу, а як Ты».

***— І гэта таксама прыклад свабоднага выбару.***

— Так. Ён разумее, што без гэтага немагчыма выратаванне чалавецтва.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Тыя, хто побач

Ганна ЧЫЖ-ЛІТАШ:

# «КАБ БЫЦЬ ШЧАСЛІВАЙ, У ПЕРШУЮ ЧАРГУ ТРЭБА ПАЛЮБІЦЬ СЯБЕ»

**Журналістку тэлекампаніі «ВаенТБ» Ганну Чыж-Літаш ведаюць у кожным падраздзяленні беларускай арміі. З мікрафонам у руках яна аб'ездзіла практычна ўсе вайсковыя злучэнні краіны. І не проста дзеля таго, каб на ўсю краіну расказаць пра службу салдат і афіцэраў, а на ўласным вопыце паспытаць тонкасці воінскіх прафесій. Ганна ўжо страляла з артылерыйскай гарматы, праходзіла выпрабаванне спецназам, вучылася гатаваць армейскія стравы і нават кіравала танкам.**

Нягледзячы на рэдкую для жанчыны вынослівасць і пагоны падпалкоўніка, якія яна носіць, Ганна — вельмі сентыментальны і шчыры чалавек. У гэтым можна пераканацца, узяўшы ў рукі хаця б адну з васьмі кніг, выдадзеных пад яе аўтарствам. Таксама Ана вядзе свой блог, у якога ўжо нямала падпісчыкаў. А яшчэ яна — мама. І гэта, па словах гераіні публікацыі, яе самая галоўная місія.

## ДАЧКА

Ганна Чыж-Літаш з'явілася на свет у сям'і афіцэра. На той момант бацька служыў у Бранску. Мама займалася дзецьмі.

— Яна мала дзе працавала, — расказвае Ганна. — Да замужжа была даволі папулярнай спявачкай у Баранавічах. Са сваёй музычнай адукацыяй выступала ў складзе шматлікіх калектываў. Сваю будучыню мама бачыла на сцэне, пакуль у Баранавічы са сваім сябрам не прыехаў мой бацька. Гэта было каханне з першага погляду. Падчас другога свайго прыезду бацька прапанаваў маёй маці выйсці за яго замуж. У яе, неверагодна прыгажуні, кавалераў было нямала, але выбар быў відавочны. Тым больш бабуля мая сказала выходзіць замуж за вайсковца. Мама, відома, не ўяўляла, што яе чакае: жыццё ў вагончыках, у лесе. Расказавала, што здарылася прачынаюцца ноччу ад таго, што ў пакоі поўзалі пацукі, а побач з хатай хадзілі дзікія звяры. У такой абстаноўцы мая старэйшая сястра рабіла свае першыя крокі.

Мінск стаў чатырнаццатым горадам, куды яны пераехалі. Тут і засталіся. У сталіцы Ганне давялося заканчваць школу. Прызнаецца, што пасля жыцця ў райцэнтры ў Мінску было няпроста. Што ў гэты момант перажывае падлетак, як складаюцца ўзаемаадносіны з аднагодкамі, яна напісала ў сваёй кнізе «Шаснаццаць».

— З кожным годам сувязь з бацькамі становіцца мацнейшай, — прызнаецца Ганна. — Ты адчуваеш нябачную пупавіну, якую даўно перарэзалі. Ты расла без яе шмат гадоў, а тут зноў ўзбе звязвае з бацькамі нешта большае. Вельмі зблізіліся з мамай пасля нараджэння маёй дачкі. Раптам мне захацелася ад яе такой жа цеплыні, як у дзяцінстве. Мама ў той момант стала для мяне космасам, сусветам. Спярша я толькі дазвалялася ёй брацца на рукі маё дзіця. Яна дагэтуль мне вельмі дапамагае з дачкой.

Нягледзячы на цесныя адносіны з мамай, Аня лічыць сябе бацькавай дачушкай. «Мы адно аднаго адчуваем і разумеем з першага погляду, — кажа яна. — Калі мне патрэбна нейкая важная парада, я патэлефаную ў першую чаргу бацьку. Усё, чаго я дасягнула ў сваім жыцці, — яго заслуга. Гэта не значыць, што ён за мяне ўсё рабіў. Не! Ён мне даваў ключы, а я сама адчыняла дзверы. Вялікае шчасце мець такога бацьку».

## ЖУРНАЛІСТ

Ганна ніколі не думала, што будзе пісаць. Па свайго першай адукацыі яна — выкладчык англійскай мовы, сацыяльны педагог-псіхолаг. Аднак у школе не адпрацавала ні дня. Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка трапіла ў міліцыю і на працягу чатырох гадоў з'яўлялася прэс-афіцэрам Партызанскага РУУС Мінска. Пісала матэрыялы аб супрацоўніках органаў унутраных спраў, аб правапарушэннях і забойствах, агучвала падзеямленні для СМІ. Але гэта было не тое, аб чым яна марыла. Ганна сама хацела займацца журналістыкай. Пасля чатырох гадоў службы ў міліцыі яна пераводзіцца ва Узброеныя Сілы, у тэлекампанію «ВаенТБ». Паралельна заканчвае журфак БДУ.

— Гэта я ўжо цяпер разумею, што самае галоўнае — не журналісцкая адукацыя, — заўважае Аня. — Прафесіяналізм прыходзіць з кожнай напісаной літарай. Усё залежыць ад самога чалавека: які ў цябе светапогляд, як ты глядзіш на людзей — з любоўю або нянавісцю. Твой характар — адлюстраванне знятых табой сюжэтаў.

І характар, прызнацца, у Ганны адметны. Варта толькі паглядзець некалькі сюжэтаў ае тэлепраекта «Праверана на сабе. Жаночы погляд». Там яна і страляе, і пераадольвае палосу перашкод, і ездзіць на ваеннай тэхніцы... «Адноўчы я сама сабе сказала: ты служыш у арміі і ў цябе ёсць магчымасць спрабаваць усё, — расказвае, як узнікла ідэя праекта, Ганна Чыж-Літаш. — Адна справа, калі цябе на здымкі кудысьці накіруюць, і, можа быць, з боку ты паглядзіш, сфатаграфуешся на фоне танка і пакажаш у сацыяльных сетках — маўляў, глядзіце, я ваенная. Я ж вырашыла пражыць лёс кожнага вайсковага спецыяліста, пастраляць з тэхнікі, акунуцца ў будні ўсіх падраздзяленняў. Для мяне гэта ўнікальны шанц. Кожны раз перажываю, ці атрымаецца. Гэта толькі здаецца, што я такая баявая. Нядаўна кіравала гусенічнай тэхнікай. Так страшна! Ты сядзіш унутры, бачыш толькі тое, што адбываецца наперадзе, і больш нічога! Ведаю, калі рэзка затармажу, магу пабіць сабе лоб. А колькі ўсяго за спінай! З чаго толькі не страляла. У мяне часам рукі трасуцца, але я перабораю свой страх: наступаю на яго абцасам або берцам і іду спрабаваць».

Фота з архіва гераіні публікацыі.

З нядаўняга часу яна вядзе і аўтарскую праграму «Па форме» на тэлеканале «Беларусь-1». Там Аня іншая. Прызнаецца, што ёй вельмі цікава працаваць у такім фармаце. Па яе словах, аўтарская журналістыка сёння вельмі патрэбная. «Я заўсёды лічыла, што журналіст — гэта асоба, — удакладняе Ганна. — Зразумела, што за ўсім, што чалавек бачыць на экране або на старонках выдання, стаіць вялізная работа каманды, але гледачы і чытачы ведаюць усяго некалькіх людзей. Журналістыка будуецца на асобах».

## АФІЦЭР

Аня выдатна страляе з пісталета Макарава, аўтамата Калашнікава, дзясяткі разоў адціснецца ад падлогі. І гэта не карцінка для яе чаргавага тэлесюжэта. Чалавек, які носіць пагоны, а тым больш падпалкоўніка, — у першую чаргу ваеннаслужачы. А гэта азначае, што неабходна не толькі ўмець карыстацца зброяй, ведаць воінскі ўстаў і выконваць загады тых, хто вышэй за цябе ў званні. Калі спатрэбіцца, трэба будзе стаць і на абарону Радзімы. І абсалютна няважна, што ты — жанчына.

— Насіць пагоны — вялікая адказнасць, — заўважае яна. — Калі пачалася спецыяльная аперацыя ва Украіне, я зразумела, што пра зброю, тэхніку можна не толькі расказваць. Яна можа выкарыстоўвацца і па прызначэнні. Калі чуеш пра вайну, якая адбываецца дзесьці далёка, па-іншаму да яе ставішся. Калі ж яна зусім блізка, разумееш, наколькі важнай справай займаешся: што азначаюць твае пагоны, якім падраздзяленнем у такім званні можна камандаваць, успамінаюцца словы клятвы на вернасць Радзіме.

На «ВаенТБ» Ганна кіруе аддзелам. У яе падначаленні — тры чалавекі. Усе — мужчыны. «У нас не проста калектыў, а каманда, — адзначае Ганна Чыж-Літаш. — Ведаю, што ў любы момант, калі мне спатрэбіцца, — наваджа, знаходжуся я ў студыі, дома або на полі бою, — яны мне дапамогуць. Нават магу перад імі расплакацца, і гэта ніколькі не панізіць мой аўтарытэт. Пад любымі пагонамі — людзі. Розныя, але ўсе прыкладна адчуваюць адно і тое ж: боль, смутак, каханне».

Неадноўчы ёй даводзілася чуць: «Ты не жанчына, а афіцэр». Іншыя кажуць, што дома яна павінна быць мамай, на рабоце — афіцэрам.

— Не магу з гэтым пагадзіцца, — кажа яна. — Я ўвесь час, з раніцы да ночы, мама. І гэтаксама я заўсёды афіцэр. Ніколі не дазволю весці сябе непрыстойна нават тады, калі я ў гэты час не ў ваеннай форме. Мне не падабаецца, калі некаторыя кажуць: маўляў, што з мяне, жанчыны, узяць. Мая праграма — адказ гэтым людзям на тое, што жанчына здольная на многае. У нас столькі крутых жанчын у арміі: і ў спецназе, і ў сувязі, чым яны толькі не кіруюць! Калі жанчына здольная на свет нарадзіць дзіця, то і з танкам, калі спатрэбіцца, разбярэцца.

Безумоўна, бацька вельмі ганарыцца сваёй дачкой. У свой час ён хацеў сына. Нарадзіліся двае прыгажуні дачушкі, абедзве ўжо носяць пагоны падпалкоўніка. «Я, у сваю чаргу, вельмі ганарыся сваім бацькам, — прызнаецца Ганна. — Прычым ён не толькі сумленны чалавек і афіцэр. Ён добры гаспадар, сем'янін. Напэўна, так доўга замуж не магу выйсці менавіта па той прычыне, што ўвесь час параўноўваю мужчын з ім. Прычым гэта адбываецца несвядома».

## ПІСЬМЕННІЦА

Пётр Літаш — чалавек ва Узброеных Сілах вядомы. Знаёмыя з ім і чытачы Ганны: свайго бацьку пад літаратурным псеўданімам палкоўнік Вінаградаў пісьменніца зрабіла галоўным героем пяці дэтэктываў. Толькі ў кнізе ён міліцыянер, а не вайсковец.

Аб тым, што з'яўляецца героем дэтэктыўнага сюжэта, Пётр Літаш даведаўся толькі тады, калі дачка заканчвала працаваць над першай кнігай. Ганна прызнаецца, што ў яе ніколі не было жадання стаць знакамітай. Сваёй кнігай яна хацела падтрымаць бацьку, якога раней часу адправілі на пенсію, ён жа вельмі хацеў працаваць. У выніку палкоўнік Вінаградаў стаў кумірам у чытачоў.

Любімай кнігай пісьменніца лічыць «Дары Бога». Гэта ўжо не дэтэктыў. Гісторыю падлеткаў, якія сутыкаюцца з усімі жорсткасцямі гэтага свету, выбудоўваюць узаемаадносіны з навакольнымі, а самае галоўнае, вераць у цуды, чытачы ўспрынялі вельмі блізка. Працягам гісторыі стаў раман «Шаснаццаць», які з'яўляецца своеасаблівым пасланнем усім бацькам аб тым, што дзеці маюць патрэбу ў іх любові. Праз кнігу «Споведзь» пісьменніца вырашыла адкрыць сваю душу пасля аднаго з найцяжэйшых этапаў у сваім жыцці — разводу. Кніга дапамагла шматлікім жанчынам: аб гэтым сведчыць вялікая колькасць паведамленняў, якія дагэтуль працягвае атрымлівать Аня.

— Людзям трэба вучыцца дзяліцца сваімі перажываннямі, — лічыць пісьменніца. — Дзяпрэсія для многіх стала нармальным станам. А чаму? Людзі трымаюць усе праблемы ў сабе, не разумеюць, што калі аб іх камусьці расказаць, хаця б таму ж псіхолагу, адразу адчуваецца палёгка. Калі ёсць неабходнасць, я ідў да псіхатэрапеўта. І вельмі гэтым ганаруся. Ана справа — клапаціцца аб сваім целе. Іншая — аб сваёй душы. Трэба вучыцца спраўляцца са сваімі эмоцыямі, каб лішні раз не хварэць. Я зразумела гэта, і мне стала жыць нашмат лягчэй.

Ганна заканчвае працу над дзявятай кнігай. «Яна адрозніваецца ад папярэдніх, — раскрывае інтрыгу член Саюза пісьменнікаў Беларусі. — У аснову пакладзена мая гісторыя. Ніяк не магу яе скончыць. Магчыма, гэта звязана з тым, што ў мяне такое адчуванне, што, калі пастаўлю кропку ў кнізе, пастаўлю кропку ў сваім асабістым жыцці».

## ШЧАСЛІВАЯ МАМА І ЎПЭЎНЕНАЯ ЖАНЧЫНА

Пры ўсёй сваёй занятасці Ганна — цудоўная мама пяцігадовай Ульяны. Яна выхоўвае дзяўчынку адна. І калі першыя тры гады, як сама прызнаецца, была ідэальнай маці (гатавала пюрэ з гародніны, у любое надвор'е па два-тры разы на дзень гуляла з малой на вуліцы), то цяпер з дачкой праводзіць не так шмат часу, як хацела б.

— На гэтым фронце я цяпер прайграю: вельмі мала часу, — тлумачыць Аня. — Мы радзка з ёй гуляем у цацкі. І не тая мама, якая сядзіць і з лялькамі размаўляе. Лепш пачытаю дачцэ кнігу, проста з ёй паразмаўляю. Або мы разам будзем штосьці гатаваць і абмяркоўваць.

У жніўні Ульяне споўніцца шэсць. Ана плануе аддаць яе ў школу. Дзяўчынка ўсур'ёз займаецца балетам. Няпроста, але яна сама пагадзілася — відаць, характарам пайшла ў маму.

— Ульяна з нараджэння (і гэта было маёй прыцыповай пазіцыяй) спала ў сваім ложку, — расказвае Ганна. — Цяпер жа не выпускаю яе са свайго: мяне так мала ў жыцці дачкі, што я павінна быць з ёй хаця б у сне. У той жа час не лічу, што мама павінна класці сябе на алтар дзеля свайго дзіцяці. Яно ўсё роўна вырасце, пойдзе з дому. А так яно вырасце больш самастойным, з павагай да асабістай прасторы іншага. Яшчэ вельмі важна, каб дзіця прыняла той факт, што ў мамы ёсць асабістае жыццё. Калі шчаслівая мама, будзе шчаслівым і дзіця.

Пры ўсёй сваёй занятасці Ганна ў выдатнай фізічнай форме. Падчас абедзеннага перапынку паспявае пазаймацца ў спартыўнай зале, на выхадныя танцуе. Сочыць не толькі за сваім знешнім выглядам, але і за харчаваннем.

— Жанчынай, як і мамай, і афіцэрам, я з'яўляюся цэлыя суткі, — гаворыць яна. — Вядома, я павінна быць прыгожай на працы, але трэба думаць аб сваім знешнім выглядзе і дома. У любым выпадку, выхадны дзень ці не, я прачынаюся, ідў ў душ, раблю макіяж, укладку. У мяне расце дзяўчынка. У свае пяць гадоў Ульяна сама выбірае сабе ўбранні, просіць яе заплесці. Няважна: дома мы ці кудысьці ідзём. Мне прыемна, што яна бярэ з мяне прыклад, хаця, шчыра скажу, што раблю гэта ў першую чаргу для сябе. Як кажа мой любімы псіхолаг Міхаіл Лабкоўскі, у якім бы целе вы ні былі, калі вы сябе любіце і прыносіце ім радасць, вам будзе ўсё роўна, як вы выглядаеце. Каб палюбіць сябе, неабавязкова мазаць твар керамам за сто доларaў. Любіць сябе — гэта ў першую чаргу паважаць сябе, клапаціцца. І вучуся гэтаму кожны дзень.

**Вераніка КАНЮТА.**

Мама, пачытай!

# ГРЫБНОЕ ВЯСЕЛЛЕ, ВЯСЁЛЫЯ ЗАДАЧКІ ДЫ МУРАШЫ-РАТАВАЛЬНІКІ

**Дзеці — бадай самая патрабавальная чытацкая аўдыторыя. Каб захапіць іх увагу, дарослым даводзіцца прыдумваць самыя неверагодныя і непадказальныя сюжэты. Выдавецкі дом «Звязда» якраз і супрацоўнічае з такімі аўтарамі-чараўнікамі, якія ўмеюць падабраць ключык да дзіцячага сэрца.**

**Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ. «САКРЭТЫ АДНАГО КАРАЛЕЎСТВА».** *Мінск, Выдавецкі дом «Звязда», 2022.*

У адным каралеўстве жыццё было мірнае і спакойнае. Жыхары весяліліся, танцавалі, працавалі, займаліся любімымі справамі. І раптам прыйшла страшная вестка. З каралём здарылася бяда... Якая — даведаецеся з казкі, перасмажы якой — не людзі, не жывёлы, не расліны... А грыбы ў выкштальцюнах рознакаляровых капялюшыках. Яны ўмеюць размаўляць, хадзіць пад зямлёй на грыбніцы і круцяць такія інтрыгі, што адарвацца немагчыма.

Дарэчы, акрамя інтрыгуючага сюжэта, кнігі захопіць увагу не толькі маленькіх дэтэктывaў, але і іх бацькоў, у кнізе ёсць інтэрактыўныя элементы. У прыватнасці, па старонках, бы ягадкі, рассыпаныя каляровыя літары. Яны дапамогуць разгадаць загадку: «Што памірыла і ўз'яднала жыхароў Грыбной дзяржавы?». За ўдзел у гульні-вандроўцы «Цікае паляванне» можна атрымаць ад аўтаркі — кніжнай феі — электронную паштоўку з казачнага каралеўства. Акрамя таго, чытачоў напрыканцы кнігі чакае сюрпрыз — буктрэйлер і размалёўкі. І, вядома ж, сачыце за анонсамі і абавязкова прыходзьце з дзецьмі на прэзентацыі кніг аўтаркі. Казачная фея Кацярына Хадасевіч-Лісавая, якая пераўвасабляецца ў герояў сваіх гісторый, заўсёды прыдумае штосьці цікавае і таямнічае.

**Уладзімір ЛІПСКІ. «ПРЫГОДЫ НУЛІКА».** *Мінск, Выдавецкі дом «Звязда», 2021.*

Гайда знаёміцца з Нулікам! «А хто гэта такі?» — спытаеце вы. Спачатку Нулік быў ніякі, нічым, ніякі. Ён уяўляў сабой роўны абадок, які нібыта саскочыў з курынага яйка. Жыў сумна, абы-як. Таму што быў адзінокі. Ні з кім не сябраваў, ні да кога не хадзіў у госці. Нічога не рабіў, толькі палежваў: то на правым баку, то на левым... Аднойчы Нуліку надакучыла ляжаць, і ён, як Калабок, пакаціўся. Не, не ў лес... А ў горад, дзе яму пашанцавала пазнаёміцца з Міколкам. Хлопчык дамаляваў Нуліку вочы, нос, рот, вушы, рукі, ногі, — і той пачаў размаўляць і хадзіць. З гэтага моманту жыццё Міколкі і Нуліка змянілася да непазнавальнасці. Яны сталі добрымі сябрамі. Малявалі, праяраліся даўжыню зубной пасты ў цюбіку, рашалі вясёлыя задачкі, прыдумвалі рознья гульні-забавы, «галавамыйкі», «адгадалкі». Вось толькі некаторыя з іх. «У кошыку ляжалі чатыры яблыкі. Мама пачаставала трох маіх сябровак. І мне адзін дала. Пасля гэтага ў кошыку застаўся адзін яблык. Чаму так атрымалася?» «Каля нашай дачы растуць чатыры бярозы. На кожнай з іх сядзе па два яблыкі. Колькі ўсяго яблыкаў на дрэве?» У кнізе багата падказак, як пераадолець вывучэнне лічбаў і колераў у гульню. Напрыканцы гісторыі, вы не паверыце, Нулік збег ад Міколкі. Як і чаму гэта здарылася і чым усё скончылася, даведаецца толькі тое, што дачытае апошнюю-казку да канца.

**Ніна ГАЛІНОЎСКАЯ. «У КАЗАЧНЫМ ЛЕСЕ».** *Мінск, Выдавецкі дом «Звязда», 2022.*

З гэтай кніжкай добра адправіцца гуляць у лес з дзецьмі. Тады прагулка абавязкова стане казачнай. Якраз ужо прачнуліся мурашы, таму чаму б не спыніцца і не панаэіраць, як яны працуюць? І пачытаць вершык «Мурашыны бой» пра тое, як ахоўнікі лесу выратавалі арэшыну ад Вусеня-нягодніка.

*Вусень сціх назаўсёды.*
*І у дрэва — свабода!*
*Лесам коціцца рэха:*
*— Будуць, будуць арэхі!*

А верш «Хата для шпакоў» можа натхніць татку разам са сваім сынам зрабіць шпакоўню сваімі рукамі і зладзіць наваселле для птушак.

*Стас пілуе дошкі сранку*
*І габлюе іх рубанкам.*
*Побач — скрынечка цвікоў.*
*Будзе хата для шпакоў.*

Ёсць у зборніку і некалькі вершаў-гульняў, якія дапамогуць дзецям разам з дарослымі цікава і з карысцю правесці час. У прыватнасці, вывучыць колеры («Заняткі ў дзіцячым садзе»).

*«Стаіць у жыце васілёк*
*І ўсміхаецца здалёк.*
*Да кветкі цягнецца рука.*
*Які берэт у васількa?*

А пасля таго, як памалявалі, чаму б не зрабіць размінку разам з дождыкам («Дзеці і дождж»)

*«Не лянуйцеся вы, ножкі,*
*Патанцуйце, ножкі, трошкі...*
*...Кап-кап-кап і тып-тып-тып,*
*Натаўку я водных круп».*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «СЧАСТЛИВЫЙ СЛУЧАЙ. 5 СЕЗОН. ТУР 2»

**1. Сведения об организаторе.**
Общество с ограниченной ответственностью «Торговая компания Ромакс» (Далее – Организатор).
УНП 190761848. Зарегистрирован решением Минского горисполкома от 04.10.2006 г. № 2011. Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 190761848.
Местонахождение Организатора: 220100, г. Минск, ул. Кульман, д. 35А, пом. 8.
Почтовый адрес: 220100, г. Минск, ул. Кульман, д. 35А, пом. 8
**2. Наименование Рекламной игры.**
**«Счастливый случай. 5 сезон. Тур 2».**
**3. Территория проведения.**
Магазины «Остров чистоты», «Остров чистоты и вкуса» на территории Республики Беларусь и интернет-магазины ostrov-shop.by, zht.by, zhs.by, zhi.by.
**4. Сроки проведения.**
14.04.2022 – 30.06.2022 (включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения Рекламной игры).
**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.**
Председатель:
1. Приявко Оксана Федотовна, ООО «Торговая компания Ромакс», маркетолог.
Члены комиссии:
1. Солодуха Никита Михайлович, ЧТУП «ЗападХимТорг», специалист по развитию.
2. Гулак Анна Владимировна, ЧТУП «ЗападХимТорг», специалист по маркетингу.
3. Шука Анна Николаевна, ООО «ЗападХимИнвест», дизайнер
4. Стасюк Евгений Владимирович, ЧТУП «ЗападХимТорг», начальник отдела рекламы.
**6. Перечень продукции, участвующей в Игре.**
Рекламная игра проводится в целях стимулирования продаж продукции торговых марок Persil, Bref, Somat, Laska, Vernel, Лоск, Clin, Пемолюкс, Gurmina, Спец (далее – товары-счастливчики), реализуемых в магазинах «Остров чистоты», «Остров чистоты и вкуса» и интернет-магазинах ostrov-shop.by, zht.by; zhs.by; zhi.by.
**7. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Рекламной игры.**
Участниками Рекламной игры могут стать физические лица – граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь, достигшие 18 лет, выполнившие условия участия в Рекламной игре.
К участию в Рекламной игре не допускаются члены комиссии.
Участники Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.
Для участия в Игре необходимо в период с 14.04.2022 по 18.05.2022 включительно:
1. Совершить покупку товаров-счастливчиков на сумму не менее 12,00 (двенадцать) белорусских рублей в любом магазине «Остров чистоты» или «Остров чистоты и вкуса» или в интернет-магазине на интернет-сайтах ostrov-shop.by; zht.by; zhs.by; zhi.by, с использованием при расчете за покупку дисконтной карты «Остров чистоты», «Остров чистоты и вкуса».
Покупатели, осуществляющие расчет за товар на кассе торгового объекта «Остров чистоты» или «Остров чистоты и вкуса» с использованием карт рассрочек («Халва», «Карта покупок», «Карта Fun» и др.), не могут быть участниками Рекламной игры, так как дисконтная карта не может быть применена при расчете картами рассрочек в соответствии с программой лояльности в магазинах «Остров чистоты», «Остров чистоты и вкуса».
2. В личном кабинете в интернет-магазине на интернет-сайтах ostrov-shop.by; zht.by; zhs.by; zhi.by (далее Интернет-сайт):
2.1. достоверно заполнить персональные данные (либо проверить корректность ранее заполненных данных) в день совершения покупки (или до момента оформления заказа через Интернет-сайт), а именно:
- фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (если такое имеется);
- дата рождения (обязательно);
- адрес проживания, пребывания в Республике Беларусь: область (обязательно), район (обязательно), населенный пункт (обязательно), улица (обязательно, при наличии), дом (обязательно), корпус (обязательно, при наличии), номер квартиры (обязательно, при наличии);
- адрес электронной почты (обязательно);
- абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи участника в международном формате (обязательно);
- оператор сотовой связи A1, MTC, life:) (обязательно).
2.2. Дать согласие Организатору (равно как и иному третьему лицу – ЗападХимТорг», ООО «ЗападХимСервис», ООО «ЗападХимИнвест») путем проставления соответствующих отметок на Интернет-сайте:
2.2.1. на обработку персональных данных для использования в целях, связанных с проведением Рекламной игры;
2.2.2. на участие в Рекламной игре;
В случае если согласие на участие в рекламных мероприятиях было дано ранее, повторное подтверждение не требуется.
3. Участник Рекламной игры вправе в любое время в период ее проведения отозвать согласие на обработку персональных данных путем направления соответствующего письменного уведомления в адрес Организатора (равно как и частного предприятия «ЗападХимТорг», ООО «ЗападХимСервис», ООО «ЗападХимИнвест»).
4. При отказе от дачи согласия на обработку персональных данных либо при последующем отзыве такого согласия участие в Рекламной игре не регистрируется (аннулируется).
5. При отсутствии согласия на участие в Рекламной игре лицо не регистрируется в данной игре в качестве участника.
Игровые коды присваиваются с первого разряда (0000001, 0000002, 0000003 и т. д.) автоматически по порядку.
Участник получает один Игровой код за покупку товаров-счастливчиков на сумму не менее 12 (двенадцать) белорусских рублей в чеке при покупке в торговых объектах «Остров чистоты» или «Остров чистоты и вкуса», на сайте интернет-магазинов ostrov-shop.by; zht.by; zhs.by; zhi.by (например, за покупку товаров-счастливчиков на сумму 70 (семьдесят) белорусских рублей в чеке участник получает пять Игровых кодов).
Каждому покупателю, который впервые совершил действия, указанные в пп.1 и пп.2 п. 7 настоящих Правил, присваивается следующий после последнего присвоенного, Игровой код на дату и время регистрации на Интернет-сайте.
Каждому покупателю, который совершил повторные действия, указанные в пп.1 настоящих Правил (и который прошел прежде регистрацию на Интернет-сайте, согласно пп. 2 п. 7), присваивается порядковый Игровой код по дате и времени покупки.
Присвоенные Игровые коды отображаются в диалоговом окне личного кабинета Интернет-сайта в течение 5 (пяти) суток после присвоения.
Каждый участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии соблюдения установленных условий Рекламной игры.
**8. Состав и размер призового фонда. Источники формирования.**
Источником формирования призового фонда является имущество, а денежные средства Организатора. Общий размер призового фонда составляет: 106630,13 (сто шесть тысяч шестьсот тридцать) рублей тринадцать копеек и включает следующие призы:

| № п/п | Наименование | Кол-во, ед., шт. | Стоимость за ед., бел. руб. | Всего стоимость за ед., бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Денежный приз в размере 45 000 белорусских рублей | 1 | 45000,00 | 45000,00 |
| | Денежные средства в размере возмещения подоходного налога за приз | 1 | 6700,08 | 6700,08 |
| 2 | Фен Dyson Supersonic HD07 (черный), Страна производитель Малайзия | 5 | 1239,00 | 6 195,00 |
| | Денежные средства в размере возмещения подоходного налога за приз | 5 | 161,08 | 805,40 |
| 3 | Смартфон Apple iPhone 13 128GB / MLP13 (голубой), Страна производитель Китай | 5 | 2898,996 | 14 494,98 |
| | Денежные средства в размере возмещения подоходного налога за приз | 5 | 409,13 | 2045,65 |
| 4 | Телевизор Samsung UE50AU9010UXRU, Страна производитель Россия | 5 | 1807,644 | 9 038,22 |
| | Денежные средства в размере возмещения подоходного налога за приз | 5 | 246,05 | 1230,25 |
| 5 | Робот-пылесос Dreame Robot Vacuum-Mop F9 / RVS5-WH0 (белый), страна производитель Китай | 10 | 582,00 | 5 820,00 |
| | Денежные средства в размере возмещения подоходного налога за приз | 10 | 62,91 | 629,10 |
| 6 | Кофемашина DE LONGHI ECAM46.860.B, Страна производитель – Италия | 5 | 1875,06 | 9375,30 |
| | Денежные средства в размере возмещения подоходного налога за приз | 5 | 256,12 | 1280,60 |
| 7 | Гриль DE LONGHI CGH1030D, Страна производитель – Китай | 5 | 719,64 | 3598,20 |
| | Денежные средства в размере возмещения подоходного налога за приз | 5 | 83,47 | 417,35 |

**9. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших участников Рекламной игры.**
Розыгрыш призов состоится 24 мая 2022 года в 14.30 по адресу г. Минск, ул. Кульман, 35А, 7-й этаж, комната переговоров.
**9.1. Порядок проведения розыгрыша.**
К моменту проведения розыгрыша Организатором формируется список Игровых кодов по возрастанию, сформированный согласно п. 7 настоящих Правил, с указанием фамилии, имени, отчества (при наличии) Участников, номера дисконтной карты, даты подтверждения согласия на участие в Рекламной игре, даты и времени совершения покупки. Игровые коды имеют одинаковую разрядность.
Для проведения розыгрыша используется лототрон, состоящий из 7 секций, каждая из которых соответствует определенному разряду Игрового кода, и несколько наборов шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 до 9. Определение выигрышных Игровых кодов получателей призов происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из секций лототрона. Розыгрыш начинается с первого разряда слева.
За ходом розыгрыша призов следит комиссия по проведению Игры. Итоги розыгрыша призов Игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.
Призовой фонд разыгрывается в последовательности, указанной в п. 8 настоящих Правил.
Игровой код победителя, выигравший один из призов, может признаваться выигрышными только один раз. В случае повторного попадания в Игровой код, уже выигравший один из призов в розыгрыше, выигрышем считается следующий по списку Игровой код.
Если следующий за выигрышным Игровой код принадлежит победителю, выигравшему один из призов, то выигравшим становится следующий после него первый Игровой код иного участника. В случае если Игровой код попадает на конец списка, то выигрышным будет считаться первый Игровой код иного участника с начала списка.
**10. Срок и способ информирования участников, выигравших призы, место, порядок и сроки выдачи призов.**
Участники-победители будут уведомлены о выигрыше посредством почты и телефонного звонка по 31 мая 2022 года включительно.
Победитель может получить приз лично, предъявляя документ, удостоверяющий личность (паспорт, вид на жительство), или его уполномоченное лицо при предъявлении документов, удостоверяющих его личность и доверенности, полученной и удостоверенной, в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, в офисе Организатора и оригинала дисконтной карты «Остров чистоты и вкуса», «Остров чистоты» по адресу: г. Минск, ул. Кульман, д.35А, пом. 8, по 30 июня 2022 года с 10.00 до 17.00 в рабочие дни, а также по предварительной договоренности с 09.00 до 17.00 в субботу 18 июня 2022 года с 12.00 до 14.00.
Организатор удерживает из суммы денежной части призов сумму подоходного налога победителя, в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
В случае отказа победителя от получения приза, или неполучения приза в установленные сроки и в установленном порядке, победитель теряет право на получение приза, и приз данного победителя остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.
Выплата денежного эквивалента стоимости приза или замена его на другой приз не допускается.
Участники Рекламной игры, претендующие на получение призов, обязуются: заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором, предоставить Организатору необходимые сведения. В случае невыполнения указанного условия Организатор имеет право отказать в выдаче призов.
Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения и заполняет все необходимые документы, предоставленные Организатором и связанные с получением приза.
**11. Название печатного средства массовой информации, в котором будут опубликованы результаты розыгрыша призового фонда, а также сроки их опубликования.**
Настоящие правила подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.
Результаты проведения Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» по 30 июня 2022 включительно.
**12. Общие условия Рекламной игры.**
Принимая участие в Рекламной игре, участник подтверждает свое ознакомление и согласие с Правилами и со всеми условиями участия в Рекламной игре.
Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Рекламной игры, а также результаты проведения Рекламной игры будут считаться окончательными и будут распространяться на все участников.
Информацию об условиях участия и проведения Рекламной игры можно получить по телефону «горячей линии» +37544 700-13-33, +37533 686-37-37 с 09.00 до 21.00, а также на сайте ostrov-chistoty.by.

*Свидетельство № 4169 о государственной регистрации Рекламной игры, зарегистрированной 29 марта 2022 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

# ГОДОВОЙ ОТЧЕТ открытого акционерного общества «МинскСортСемОвощ» за 2021 г.

| | |
|---|---|
| Открытое акционерное общество | «МинскСортСемОвощ» |
| Учетный номер плательщика | 600052664 |
| Местонахождение | 220014, г. Минск, ул. Кузьмы Минина, д. 21, корп. 1 |
| Телефон, факс (с междугородними кодами) | тел. (17) 374-25-87, ф. (17) 373-25-96 |
| Адрес электронной почты | info@msso.by |
| Адрес официального сайта в глобальной компьютерной сети Интернет | www.msso.by |

**4. Доля государства в уставном фонде эмитента** – 5,166 (всего в процентах), в том числе:

| Вид собственности | Количество акций, штук | Доля в уставном фонде, % |
|---|---|---|
| Республиканская | 4184 | 5,166 |
| Коммунальная – всего | - | - |

**5-6. Информация о дивидендах и акциях:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров – всего | лиц | 1214 | 1214 |
| В том числе: юридических лиц | лиц | 5 | 5 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 2 | 2 |
| В том числе: физических лиц | лиц | 1209 | 1209 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 1 | 1 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 59,931 | 50,213 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 59,734 | 48,524 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,74 | 0,62 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) | X | X | X |
| типа _____ | рублей | - | - |
| типа _____ | рублей | - | - |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,73757 | 0,59915 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) | | - | - |
| типа _____ | рублей | - | - |
| типа _____ | рублей | - | - |
| Период, за который выплачивались дивиденды | месяц, квартал, год | 2020 год | X |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | 31.03.2021 | X |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | государству – до 22.04.2021 г., прочим – с 04.05.2021 по 04.06.2021 г. | X |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 292,73 | 263,97 |
| Количество акций, находящихся на балансе общества, – всего | штук | - | - |

**7. Отдельные финансовые результаты деятельности открытого акционерного общества:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 34921 | 29816 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг; управленческие расходы; расходы на реализацию | тысяч рублей | (29114) | (24498) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (Прибыль (убыток) отчетного периода) | тысяч рублей | 3064 | 4005 |
| В том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 5807 | 5318 |
| прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тысяч рублей | (2482) | (2443) |
| прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | тысяч рублей | (261) | 1130 |
| Налог на прибыль, изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тысяч рублей | (758) | (1032) |
| Чистая прибыль (убыток) | тысяч рублей | 2306 | 2973 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | 21211 | 18946 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | тысяч рублей | - | - |
| Долгосрочные обязательства | тысяч рублей | - | - |
| 8. Среднесписочная численность работающих | человек | 240 | 215 |

**9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено 20 и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг:** оптовая торговля – 43,8 %, розничная торговля – 56,2 %.
**10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждены годовой отчет, бухгалтерский баланс, отчет о прибылях и убытках за отчетный 2021 год:** 31 марта 2022 г.
Аудиторское заключение по бухгалтерской отчетности подготовлено 21 февраля 2022 г.
Аудит проведен частным аудиторским унитарным предприятием «ЭВЕРТОНАУДИТ», местонахождение: Республика Беларусь, 223028, Минская область, Минский район, д. Ждановичи, ул. Огинского, д. 10. Зарегистрировано решением Минского облисполкома в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 14.08.2003 г. УНП 190191575
**Период, за который проводился аудит:** 01 января – 31 декабря 2021 года.
**Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской (финансовой) отчетности, а в случае выявленных нарушений о влиянии бухгалтерской (финансовой) отчетности – сведения о данных нарушениях:** «прилагаемая годовая бухгалтерская отчетность ОАО «МинскСортСемОвощ» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «МинскСортСемОвощ» по состоянию на 31 декабря 2021 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, законченный на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь».
**Дата и источник опубликования аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности в полном объеме:** 31.03.2022 Единый информационный ресурс рынка ценных бумаг.
**13. Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения:** Регламент работы с реестром акционеров утвержден общим собранием акционеров 30.03.2010 г. Положение о порядке ведения учета и предоставлении информации об аффилированных лицах утверждено наблюдательным советом от 31.01.2017 г. Положение о наблюдательном совете утверждено общим собранием акционеров 31.03.2020 г.
**14. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет:** www.msso.by

Руководитель А.А. Черняк
Главный бухгалтер С.Н. Беленович

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

УНП 600537220

# ЛОГОЙСКИМ СЕЛЬСКИМ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫМ КОМИТЕТОМ (организатор аукциона) по продаже гражданам Республики Беларусь земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена (бел. рублей) | Размер задатка (бел. рублей) | Затраты на организацию и проведение аукциона (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **аг. Гостиловичи, ул. Луговая, 5А, кадастровый номер 623284601601000369** | 0,0967 | газификация, электрификация, водоснабжение | 17 000,00 | 1700,00 | 2268,93 + расходы за размещение объявления |
| 2 | **д. Знаменка, ул. Весенняя, 14, кадастровый номер 623284603001000248** | 0,1196 | газификация, электрификация, | 10 000 | 1000,00 | 2136,06 + расходы за размещение объявления |

**Дата, время и место проведения аукциона:** 11 мая 2022 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6, Логойский сельский исполнительный комитет, контактные тел.: (801774) 28473, (8029) 1779511.
